# Шукайце беларускае!

**У будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася цырымонія перадачы культурнай спадчыны Беларусі ад польскага прафесара Базыля Белаказовіча.**

Міністэрствам замежных спраў і замежнымі ўстановамі Беларусі праводзіцца сістэмная работа па вяртанню на Радзіму гістарычнай і культурнай спадчыны, якая апынулася ў сілу розных абставінаў за межамі Беларусі.

Плённа ў гэтым накірунку працуе Пасольства Беларусі ў Польшчы: была праведзена работа і атрымана з асабістага архіва беларуса па паходжанню, вядомага вучонага і даследчыка, прафесара Базыля Белаказовіча больш за 300 асобнікаў гістарычнай, навукова-папулярнай літаратуры, уласных навуковых прац, кніжак і іншых матэрыялаў.

Базыль Белаказовіч нарадзіўся ў Беластоцкай вобласці. Закончыў Ленінградскі ўніверсітэт — філалагічны і гістарычны факультэт і дактарантуру Варшаўскага ўніверсітэта. У 1972 годзе атрымаў навуковае званне доктара навук па спецыяльнасці польская і славянская філалогія, а ў 1978 годзе званне прафесара. Мае больш за 1000 публікацый, у тым ліку 12 кніжак. Працаваў асістэнтам, ад'юнктам, дацэнтам у Варшаўскім універсітэце, намеснікам дырэктара Інстытута рускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта, кіраўніком аддзелаў Польскай акадэміі навук, загадчыкам кафедры ўсходнеславянскага літаратуразнаўства Ольштынскага ўніверсітэта. З'яўляўся ганаровым доктарам навук Ленінградскага і Наўгародскага ўніверсітэтаў. Большую частку сваёй навуковай дзейнасці прысвяціў вывучэнню творчасці Льва Талстога і Адама Міцкевіча. Узнагароджаны медалём А. Пушкіна, медалём Камісіі народнай адукацыі Польшчы, Кавалерскім і Афіцэрскім Крыжамі, мае ганаровае званне «Заслужаны настаўнік». На працягу шэрагу гадоў прымаў удзел у навуковых канферэнцыях у Беларускім дзяржаўным універсітэце і Акадэміі навук Беларусі, з'яўляецца арганізатарам і пастаянным удзельнікам міжнародных кангрэсаў і навуковых канферэнцый «Шлях да ўзаемнасці». Сёння звесткі аб навуковай дзейнасці Б. Белаказовіча апублікаваны ў Залатой кнізе гуманітарных навук Польшчы.

Тадэуш Стружэўскі, саветнік пасольства Рэспублікі Беларусь у Польшчы, адзначыў, што прафесар Б. Белаказовіч адзін з самых яркіх і самых творчых прадстаўнікоў беларускай меншасці ў Польшчы. Што ён беларус не толькі па паходжанню, але і па свайму духу, па сваіх шчырых адносінах да сваёй гістарычнай радзімы. Чалавек, які прысвяціў усю сваю навуковую працу вывучэнню беларуска-польскай гістарычнай літаратурнай спадчыны і які садзейнічае развіццю беларуска-польскіх культурных зносін. Гэта яскравы прыклад таго, як чалавек, жывучы за межамі сваёй краіны, аддана і трапятліва адносіцца да да сваёй гістарычнай радзімы.

Сам прафесар Белаказовіч у час свайго выступлення адзначыў, што яго надзвычай узрадавала вестка аб стварэнні новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Ён перакананы, што з гадамі гэта бібліятэка стане сапраўднай скарбніцай не толькі беларускіх і славянскіх, але і еўрапейскіх ведаў, навукі, культуры і асветы. «Я вельмі спадзяюся, што мой дар будзе садзейнічаць умацаванню і пашырэнню гістарычна сфарміраваных культурных зносінаў паміж Рэспублікай Польшча і Рэспублікай Беларусь. Што гэты дар будзе вельмі карысным для беларускіх студэнтаў і навукоўцаў, якія спецыялізуюцца ў галіне славістыкі, фалькларыстыкі і этнаграфіі».

Акрамя Нацыянальнай бібліятэкі прывезеныя ў Беларусь матэрыялы атрымаў і Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

Пасольствам Беларусі ў Польшчы плануецца таксама збор і перадача беларускім музеям, архівам і бібліятэкам навуковых работ, літаратурных і мастацкіх твораў, матэрыялаў з асабістых архіваў і архіваў іншых вядомых навукоўцаў, мастакоў, пісьменнікаў і паэтаў — беларусаў па паходжанню, пражываючых у Польшчы. Таму шукайце беларускае!

**Марына ПЫРКОВА.**